**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# МУРАШКА РЫГОР ДАНІЛАВІЧ

**ПРАЗАІК**

**3 (16) ЛЮТАГА 1902 г. – КРАСАВІК 1944 г.**

**ФОНД № 441**

**ВОПІС № 1**

**[1900-я гг.] – 2002**

**МІНСК 2018**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 441**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | РУКАПІСЫ Р.Д. МУРАШКІ | 1 - 21 | 1 - 3 |
| 2. | ПЕРАПІСКА | 22 - 31 | 3 - 4 |
| 3. | ДАКУМЕНТЫ ПРА Р.Д. МУРАШКУ | 32 - 38 | 4 |
| 4. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ | 39 - 41 | 4 |
| 5. | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Рыгор Данілавіч Мурашка** нарадзіўся 16 лютага 1902 г. у вёсцы Бязверхавічы  Слуцкага павета Мінскай губерніі (цяпер Слуцкі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і. Скончыў народную школу, потым у 1916 г. – двухкласную валасную школу. У 1917-1918 гг. вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі, але яна была зачынена польскімі ўладамі як "пралетарская ўстанова". Пачынаючы з гэтага года Р.Д. Мурашка на доўгі час звязвае жыццё з войскам. У 1920 г. скончыў інструктарскія курсы пры Наркамаце ўнутраных спраў Беларусі і працаваў інструктарам Слуцкага павятовага ваенрэўкома. Служыў у Чырвонай Арміі (1920-1921,1924-1926). У 1921 г. абіраўся членам валаснога зямельнага аддзела Слуцкай акругі і загадчыкам хаты-чытальні, а праз некаторы час устанавіў сувязь з літаратурным аб'яднаннем "Маладняк". Быў адказным сакратаром часопіса "Бальшавік Беларусі" (1926-1929), загадваў аддзелам мастацкай літаратуры ў Дзяржвыдавецтве БССР (1930-1933). Прымаў удзел у арганізацыі Першага тыдня беларускай літаратуры і мастацтва ў Маскве. З 1939 г. – загадчык кабінета маладога аўтара СП БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны – удзельнік мінскага падполля, з восені 1943 г. – партызан. Дапамагаў ў распрацоўцы плана знішчэння В. Кубэ. Па заданні падпольшчыкаў збіраў і перадаваў праз сувязных неабходныя партызанам звесткі. Яны датычылі дзейнасці гарадской управы, гандлёвых фірм, прамысловых прадпрыемстваў. транспарту, акупацыйных органаў друку, устаноў культуры г. Мінска. Асаблівую каштоўнасць уяўлялі дакладныя звесткі пра рабаўніцтва і вываз з Беларусі культурных багаццяў рэспублікі. Загінуў Р.Д. Мурашка ў красавіку 1944 г. у час прарыву партызанскай блакады на Лагойшчыне*.

Літаратурны дэбют Р.Д. Мурашкі адбыўся ў 1924 г., калі ў газеце "Савецкая Беларусь" было надрукавана апавяданне "Папоўскі шлюб". Аўтар зборнікаў апавяданняў "Стрэл начны ў лесе" (1926), "Прыгранічны манастыр" (1930), "Званкі" (1931), "Рузікі" (1932), "Мюдаўская ноч" (1934), аповесці "У іхнем доме" (1929), раманаў "Сын" (1929), "Салаўі святога Палікара" (1940, апублікаваны ў 1967), "Насуперак лёсу" (1942, пад псеўданімам Мікалай Дуброўскі, не друкаваўся), "Таварышы" (1942, пад псеўданімам Максім Загорскі, друкаваўся ў часопісе "Полымя" (1993), навэлы "Смерць маткі" (1942, пад псеўданімам РЭМ, друкавалася ў лагойскай падпольнай газеце "За Савецкую Беларусь") і інш.

Член СП СССР з 1934 г.

---

* Дакументы Р.Д. Мурашкі захоўваюцца таксама ў НАНБ (ф.4. воп. 33 а)

Дакументы Р.Д. Мурашкі паступілі ў аддзел фарміравання НАФ БДАМЛМ у 2002 г. ад дачкі пісьменніка Анцінеі Рыгораўны. У 2018 г. яны прайшлі навукова-тэхнічную апрацоўку, у выніку чаго быў складзены воп. №1 у колькасці 41 справы (93 дак.) за [1910-я]-1944, 1956-2002 гг.

Вопіс складаецца з 4 раздзелаў.

1. У раздзеле "Рукапісы Р.Д. Мурашкі" справы сістэматызаваны па жанрах і храналогіі за 1932-1944 гг. У раздзеле сабраны: раманы "Насуперак лёсу", "Таварышы", кінааповесць "Сын" (часткі 6,7), казкі: "Шчасце", "Тамерланава смерць" (пад псеўданімам Мікалай Дуброўскі), агляд вершаў маладых паэтаў, артыкулы, дзённікавыя запісы пра жыццё ў акупаваным Мінску, навэла "Смерць маткі"; публікацыя Р.П. Платонава інфармацый-аглядаў Р.Д. Мурашкі "Минск оккупированный. Новые архивные свидетельства".

2. Раздзел "Перапіска" складаецца з 2-х груп дакументаў. У першай – пісьмы Р.Д. Мурашкі да П.С. Кабзарэўскага, В.А. Селяха, А.М. Тычыны, К. Чорнага, удзельнікаў мінскага падполля і інш. Другая група сабрала пісьмы да Р.Д. Мурашкі С.І. Казанцава – камандзіра спецгрупы Цэнтральнага і Беларускага штаба партызанскага руху, М.Т. Паслядовіча, Б. Сасноўскага і інш.

3. Раздзел склалі: мяркуемы зборнік А.Р. Мурашкі (дачкі) "Успаміны пра бацьку", артыкулы Н.С. Гілевіча, А. Лістапада пра яго, рэцэнзіі Ю.С. Пшыркова, М.Х. Хведаровіча на раман "Сын", аповесць "У іхнем доме". За раздзелам змешчаны 2 нумары газеты "Мы отомстим" за 1943, 1944 гг., палітычная карта міру і Заходняй Еўропы за 1936 год.

4. У раздзел увайшлі фатаграфіі: Р.Д. Мурашкіі, С.Е. Мурашкі (Караневіч) – жонкі, індывідуальныя і ў групе з дачкой Анцінеяй і сынам Генадзем, братам Мікалаем.

Прадмову склала
вяд. архівіст
12.02.2018 г.

І.А. Евенка

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. РУКАПІСЫ Р.Д. МУРАШКІ** | | | | |
| 1 | М. Дуброўскі. "Насуперак лёсу". Раман. Варыянт. Аўтограф | 1942 | 239 | 1 | |
| 2 | М. Дуброўскі. "Насуперак лёсу". Раман. Варыянт. Пачатак.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1942 | 95 | 2 | |
| 3 | М. Дуброўскі. "Насуперак лёсу". Раман. Варыянт. Працяг.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | 1942 | 110 | | |
| 4 | М. Дуброўскі. "Насуперак лёсу". Раман. Варыянт. Заканчэнне.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай.<br>Прыкладзены ўрывак з  раману - выразка з газеты. 1942 | 1942 | 81 | | |
| 5 | М. Загорскі. "Таварышы". Раман.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | 1942 | 164 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 6 | "Сын". Кінааповесць. Часткі 6,7.<br>Выразка з часопіса | 1932 | 15 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 7 | "Шчасце". Казка.<br>Аўтограф | [1942] | 16 | 1 | |
| 8 | М. Дуброўскі. "Тамерланава смерць". Казка. Варыянты.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | [1942] | 22 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 9 | "Надыходзіць вясна"="І дождж паэзіі на вас". Агляд вершаў маладых аўтараў, дасланых у рэдакцыю газеты "Піянер Беларусі".<br>Аўтограф | 1940 | 3 | 1 | |
| 10 | "Дыфірамб Слову". Артыкул. Варыянты.<br>Аўтограф, машынапіс | [1942] | 9 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 11 | "Вітанні", "Чаму прыпыніўся шматвяковы баронскі род Швайнбергаў". Артыкулы. Варыянты.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай.<br>Да артыкулаў прыкладзена пісьмо Р.Д. Мурашкі ў рэдакцыю газеты "Савецкая Беларусь" ад 05.07.1943 г. | 1943 | 23 | 4 | |
| 12 | "Рабаўніцтва насельніцтва і здзекі з яго", "Аб межах знішчэння пажарам г. Мінска" і інш. Артыкулы, звесткі пра рабаўніцтва, вываз з Беларусі ў Германію культурных багаццяў рэспублікі.<br>Аўтограф | [1943] | 12 | 4 | |
| 13 | "Дарагая магіла". Артыкул пра наведванне магілы М.А. Багдановіча ў Ялце.<br>Аўтограф | [1943] | 11 | 1 | |
| 14 | "Да справы паўднёвае мяжы Беларусі". Артыкул. Без канца.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай | [1943-1944] | 4 | 1 | |
| 15 | "Адваротная агітацыя". Артыкул пра "нямецкую прапаганду" жыцця ў Германіі. Варыянты.<br>Аўтограф.<br>На адваротных старонках аднаго з варыянтаў артыкула - навэла "Смерць маткі" - аўтограф | [1944] | 12 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 16 | (пад псеўд. РЭМ) "Смерць маткі". Навэла. Варыянты.<br>Аўтограф, газета "За Савецкую Беларусь" (Лагойск) | 1944 | 7 | 2 | |
| 17 | "Кароткая гістарычная даведка аб зараджэнні і шляху беларускае НЦД у Савецкай Беларусі і за рубяжом".<br>Аўтограф | [1944] | 5 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 18 | Данясенні Р.Д. Мурашкі камандзіру спецыяльнай разведгрупы Цэнтральнага штаба партызанскага руху маёру С.І. Казанцаву.<br>Аўтограф | 1944 | 8 | 6 | |
| 19 | Запісы пра прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі, палітычных эмігрантаў, якія пайшлі на супрацоўніцтва з акупацыйнымі ўладамі г. Мінска (1941-1943), "сістэму ўстаноў нямецка - беларускай адміністрацыі". | [1944] | 13 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Аўтограф | | | | |
| | * * * | | | | |
| 20 | "Минск оккупированный. Новые архивные свидетельства". Інфармацыі - агляды Р.Д. Мурашкі камандзіру спецгрупы Цэнтральнага і Беларускага штабоў партызанскага руху С.І. Казанцаву (НАРБ, ф.4 воп. 33 а, спр. 611), падрыхтаваныя да друку Р.П. Платонавым. Выразкі з газет | 1994 | 6 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 21 | Спіс рукапісаў Р.Д. Мурашкі (няпоўны). Аўтограф А.Р. Мурашкі. На адваротнай старонцы Л.2 - запіска Я. Скрыгана да неўстаноўленай асобы | [1990-я гг] | 2 | 2 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА** | | | | |
| 22 | Пісьмы Р.Д. Мурашкі да П.С. Кабзарэўскага, К. Чорнага. Арыгінал, фотакопія. У пісьме да К. Чорнага - чарнавы накід твора Р.Д. Мурашкі (урывак) і просьба А. Матусевіча даслаць пісьмо сям'і | 1940,1944 | 5 | 3 | |
| 23 | Пісьмо Р.Д. Мурашкі да В.А. Селяха. На адваротнай старонцы пісьма - пісьмы да "таварыша Гарошкі" і "Кветкі". Прыкладзена машынапісная копія пісьма да В.А. Селяха | 1944 | 3 | 3 | |
| 24 | Пісьмы Р.Д. Мурашкі да А.М. Тычыны | 1944 | 4 | 2 | |
| | * * * | | | | |
| 25 | Пісьмы Р.Д. Мурашкі да С.І. Казанцава - камандзіра спецгрупы Цэнтральнага і Беларускага штаба партызанскага руху | 1944 | 2 | 2 | |
| 26 | Пісьмы Р.Д. Мурашкі да "Крымава". На адным з пісем - пісьмо да "Марыі К-ны", на другім - да А.М. Тычыны | 1944 | 7 | 7 | |
| 27 | Пісьмы Р.Д. Мурашкі да "сябра Аркадзя", "сябра Алеся", "сябра Марыі" і інш. падпольшчыкаў | 1944 | 7 | 7 | |
| | * * * | | | | |
| 28 | Пісьмы - заданні С.І. Казанцава - камандзіра спецгрупы Цэнтральнага і Беларускага штаба | 1944 | 9 | 6 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | партызанскага руху | | | | |
| 29 | Пісьмо "Крымава" аб расколе беларускай інтэлігенцыі | 1944 | 1 | 1 | |
| 30 | Пісьмо М.Т. Паслядовіча пра абставіны свайго жыцця | 1943 | 1 | 1 | |
| 31 | Пісьмо Б. Сасноўскага аб друкаванні ў газеце "За Савецкую Беларусь" навэлы М.Р. Мурашкі "Смерць маткі" | 1944 | 1 | 1 | |
| | **3. ДАКУМЕНТЫ ПРА Р.Д. МУРАШКУ** | | | | |
| 32 | А.Р. Мурашка. "Успаміны пра бацьку". Мяркуемы зборнік.<br>Аўтограф, машынапіс, рукапіс | 1993 | 105 | 1 | |
| 33 | А.Р. Мурашка. "Успаміны пра бацьку". Варыянт.<br>Аўтограф | 1972 | 18 | 1 | |
| 34 | Н.С. Гілевіч. "З пафасам кастрычніка ў сэрцах". А. Лістапад. "Жыве сярод нас". Артыкулы пра Р.Д. Мурашку і з упамінаннем пра яго.<br>Выразкі з газет | 1968,2002 | 2 | 2 | |
| 35 | Рэцэнзія Ю.С. Пшыркова, заключэнне М. Хведаровіча на раман Р.Д. Мурашкі "Сын", аповесць "У іхнем доме".<br>Аўтограф Ю.С. Пшыркова, аўтарызаваны машынапіс М. Хведаровіча | 1956,1963 | 20 | 3 | |
| 36 | Акт прыёму - перадачы дакументаў А.Р. Мурашкі (дачкі) з асабістага архіва Р.Д. Мурашкі ў Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры | 1987 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 37 | "Мы отомстим". Газета Н-скай партызанскай брыгады. | 1943,1944 | 4 | 2 | |
| 38 | Палітычная карта міру і Заходняй Еўропы | 1936 | 2 | 2 | |
| | **4. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ** | | | | |
| 39 | Фатаграфія Р.Д. Мурашкі, індывідуальная. [1930-я гг].<br>Копія | | 1 | 1 | |
| 40 | Фатаграфіі С.Е. Мурашкі (Караневіч) (жонкі), індывідуальныя | [пач.1920-х гг, кан.1940-х гг] | 2 | 2 | |
| 41 | Фатаграфіі Р.Д. Мурашкі з жонкай, дачкой Анцінеяй | [1910-я-1930-я гг] | 7 | 7 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | і сынам Генадзям, братам Мікалаем | | | | |

У дадзены вопіс унесена 41 (сорак адзін)

спраў з № 1 па № 41 , 93 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

_______________________

Дакументы прынялі:

_______________________

_______________________

"_____"____________20____ г.